**Прыгажосць – не толькі формы цела,**
**а надзвычайна добры стан душы.**

**Паседжанне паэтычна-музычнай гасцінай “Натхненне”.**
**08.12.2023г.**

Прыемна прыгажосць пабачыць,
Краса – не вельмі часты госць,
Ды надта радасна адзначыць,
Калі яна, на шчасце, ёсць.

У рамках работы клуба “Патрыёт”, які працуе ў аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ “Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна” адбылося чарговае паседжанне паэтычна-музычнай гасцёўні “Натхненне”, тэма якога “Прыгажосць – не толькі формы цела, а надзвычайна добры стан душы”. Адкрыла мерапрыемства загадчык аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту Кацярына Купрэева.






На працягу ўсяго паседжання вядучыя гасцёўні Дзіяна Купрыянюк і Тэрэса Кошань вялі размову пра прыгажосць, якая ўвасабляе ў сабе і маляўнічасць роднай мовы, і вытанчаны дзявочы стан, і хараство нашай прыроды, і дастаўляе эстэтычную і маральную асалоду кожнаму з нас. Прысутным прапанавалі паслухаць прыгажосць паэтычнага слова, якое прагучала ў выкананні мясцовай паэтэсы Іны Бутурля. Іна пазнаёміла нас са сваёй творчасцю, расказала аб сваіх захапленнях (бо яна вельмі markdown рознабаковы і таленавіты чалавек), сярод якіх кулінарыя, арыгамі, выцінанка, вязанне прыгожых рэчаў для сваёй дачкі, а пасля прачытала вельмі цікавыя добрыя вершы. Для нашай паэтэсы творчасць – гэта яе душа, яе унутранае патрабаванне, неабходная, а, мабыць, і галоўная частка яе жыцця. Вершы можна знайсці на старонках газеты “Ашмянскі веснік”, у сацыяльных сетках – Інстаграм, Аднакласнікі, У Кантакце. Піша аўтар як на рускай, так і на беларускай мове.





Яўгенія Янішчыц, наша беларуская паэтэса, напісала: “Калі ў душы ад сэрца цесна, то нараджаюцца радкі”.  Гэтыя словы як найлепш падыходзяць да  Іны Бутурля.

Прыгажосць сваімі рукамі стварае цырульнік Аксана Карповіч, якая працуе ў сацыяльным пункце ДУ “ТЦСАН Ашмянскана раёна”. Пад час сустрэчы пазнаёміла прысутных з сакрэтамі сваёй прафесіі і адказала на іх пытанні, правяла майстар-клас па кладцы і стрыжцы валасоў. Вынік работы майстра прадэмантравалі нашы наведвальнікі.



Музычная прыгажосць!  Пра яе можна гаварыць і гаварыць. Удзельнікі арт-студыі “Не старэючыя галасы” аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ “ТЦСАН Ашмянскага раёна” выканалі песню “Колькі ў небе зор”, аўтарам слоў і музыкі якой з’яўляецца Аляксандр Шыдлоўскі, які ў свой час працаваў  дырэктарам Гродзенскага абласнога Дома народнай творчасці. Вальсавай мелодыяй лілася песня, плыла і клікала ўдалячынь, у маладосць, ціснула за сэрца і навявала прыемныя ўспаміны. Хаваючы няпрошаную слязінку, прысутныя спявалі разам з нашымі артыстамі.

Напрыканцы мерапрыемства быў паказаны відыяролік аб тым, як правільна і прыгожа зрабіць макіяж у хатніх умовах, якой касметыкай трэба карыстацца ва ўзросце 60+.

Сустрэча закончылася і, спадзяемся, што ў душы кожнага засталіся словы:
“Красою карыстацца трэба ўмела, прыдатнай каб не перайсці мяжы, бо прыгажосць – не толькі формы цела, а надзвычайна добры стан душы”.

Тэрэса Кошань
спецыяліст па сацыяльнай рабоце
ДУ “ТЦСАН Ашмянскага раена”